У прыказках і прымаўках, у склад якіх уваходзяць вытворныя УАІ, намі было зафіксавана 4 імені, якія ўжываюцца як ў поўнай, так і ў размоўна-бытавой форме (***Іван*** *– Ян, Янка, Іванец;* ***Кацярына*** *– Кацярынка;* ***Пётр*** *– Пятрок;* ***Фама*** *– Хімка, Хомка).* Толькі ў размоўна-бытавой форме было зафіксавана 13 імён (*Несцерка, Анюта, Гануля – Гандзя, Маруся – Мар'я, Парася – Параска, Саўка, Сенька, Федзька, Хадоська, Цімошка, Юрка, Якімка, Яська*).

1. Беларускія прыказкі, прымаўкі і загадкі / Склад. М.Я. Рапановіч. – Мінск: Вышэйшая школа, 1958. – 328 с.
2. Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / Склад. Ф.М. Янкоўскі; Прадм. Д.Я. Бугаёва. – Мінск: Бел. навука, 2004. – 494 с.

## МАСТАЦКАЕ АДЛЮСТРАВАННЕ АСОБЫ І ДЗЕЙНАСЦІ ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ У РАМАНЕ "СПАКУСА" Т. БОНДАР

***Налётава Н.М.,***
*аспірант ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – Бароўка В.Ю., доктар філал. навук, прафесар*

Мастацкае адлюстраванне айчыннымі пісьменнікамі XX – пачатку XXI стагоддзя (В. Іпатавай, А. Асіпенкам, Т. Бондар, У. Арловым, В. Коўтун, В. Зуёнкам, Д. Бічэль-Загнетавай, А. Лойкам і інш.) асобы і дзейнасці асветніцы, гуманісткі, ігуменні, падзвіжніцы, міратворцы і ўплывовага грамадскага дзеяча XII стагоддзя Еўфрасінні Полацкай дае магчымасць сучасніку азнаёміцца з духоўным жыццём нашых далёкіх продкаў, шляхамі іх асобаснага і грамадскага самавызначэння і, несумненна, высокім узроўнем развіцця культуры. Гэта адыгрывае важную ролю ў выхаванні патрыятычных пачуццяў суайчыннікаў, развіцці іх гістарычнай памяці ва ўмовах распаўсюджанага нацыянальнага нігілізму.

Мэта артыкула – прааналізаваць вобраз вядомай асветніцы XII стагоддзя Еўфрасінні Полацкай у рамане "Спакуса" (1989) беларускай пісьменніцы Т. Бондар.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання выступілі "Аповесць жыцця і смерці святой і блажэннай і найпадобнейшай Еўфрасінні …" і раман "Спакуса" Т. Бондар. Метады: апісальна-аналітычны, параўнальны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Мастацкае адлюстраванне жыццёвага шляху і дзейнасці Еўфрасінні Полацкай у рамане "Спакуса" Т. Бондар падначальвалася мэце пераасэнсаваць зробленае ёй, адной з перадавых асоб свайго часу, а таксама падкрэсліваць важную ролю Еўфрасінні Полацкай у развіцці нацыянальнай культуры. Па сутнасці, гэта адна са спроб (раней былі апублікаваны аповесць "Прадыслава" В. Іпатавай, раман "Святыя грэшнікі" А. Асіпенкі) праз мастацкае слова данесці да чытача духоўныя пошукі святой, сцвердзіць думку пра гуманістычную і асветніцкую скіраванасць яе дзейнасці.

Заўважым, што асноўнай крыніцай для напісання згаданага твора, як і іншых аналагічных твораў-жыццяпісаў нашай славутай зямлячкі, была створаная невядомым аўтарам "Аповесць жыцця і смерці святой і блажэннай і найпадобнейшай Еўфрасінні … ", у якой (як таго вымагаў жанр агіяграфіі) створаны ідэальны вобраз святой. Сапраўды, пры стварэнні мастацкага твора пра наша далёкае мінулае пісьменніца, як і яе папярэднікі, абапіралася на многія факты з жыційнага твора: прыняцце пострыгу полацкімі князёўнамі Прадславай, Гардзіславай і Звеніславай; будаўніцтва Іаанам царквы Святога Спаса; асветніцкая і міратворчая дзейнасць Еўфрасінні Полацкай; кантактаванне Полацкага княства з Візантыяй і інш.

Еўфрасіння Полацкая падаецца ў рамане "мужнай, моцнай целам і духам" [2, с. 10], "палкай" [2, с. 12], "рашучай" [2, с. 12], разумнай, адукаванай, прыгожай і набожнай асобай, якая "з малых гадоў, адчуўшы ў сэрцы сваім любоў да ўсявышняга, збірала … думкі дабрачынныя гэтак жа рупліва, як пчала мёд у соты" [2, с. 16] і верыла, што "робіць угодную яму справу" [2, с. 11]. Гэта не супярэчыць яе апісанню, пададзенаму ў агіяграфічным творы. Так, у апошнім заўважаецца, што Прадслава "была вельмі здольная да кніжнай навукі, нават не дасягнуўшы яшчэ паўналецця, і было гэта плёнам малітвы. І па ўсіх гарадах разышлася слава пра яе мудрасць, і добрыя здольнасці да навук, і красу цялесную, бо была яна прыгожая надта абліччам" [1, с. 44].



Рэпазіторый ВГУ

Агаворымся, што стварэнне пісьменнікамі вобразаў вядомых гістарычных асоб, безумоўна, з'яўляецца суб'ектыўным, але яно не павінна скажаць рэальнага аблічча адлюстраванай асобы. Так, у рамане Т. Бондар рэальна-прататыпнае цесна спалучана з мастацкім вымыслам, які, да прыкладу, выяўляецца ў адлюстраванні псіхалагічнага стану гераіні, яе знаёмстве з юнай скамарошкай Еўкай і кавалём Златам і інш.

З традыцыйных літаратурных прыёмаў для раскрыцця характару гераіні пісьменніца актыўна выкарыстоўвае дыялогі, сны і ўнутраныя маналогі.

У рамане "Спакуса" Т. Бондар неаднойчы засяроджвае ўвагу на тым, як у душы ігуменні, што слухае гул званоў Святой Сафіі, узмацняецца вера ў Хрыста. З тэксту твора вынікае, што гераіня з годнасцю пераадолела ўсе спакусы свецкага жыцця (грахоўныя сны, мары аб вечнай славе) і засталася вернай служкай Хрыстовай. Паказальным у гэтым плане з'яўляецца эпізод наведвання ігуменні язычніцкага капішча: "Павінна было прагучаць слова божае з вуснаў праведнікаў ў час, у міг, падобны гэтаму… Нават калі суджана ўмерці …" [2, с. 279].

З тэксту рамана вынікае, што ігумення цікавілася не толькі пытаннямі духоўнага жыцця, але і свецкага, прымала непасрэдны ўдзел у іх вырашэнні (узгадаем выгнанне князя Рагвалода Барысавіча з дружынаю з Полацка, асуджэнне палітыкі Расціслава Глебавіча). Пісьменніца адзначае, што ў такія моманты Еўфрасіння трымалася годна і не давала волі эмоцыям: "цвёрды, рашучы голас" [2, с. 71], "спакойная, халодная і непадступная ў сваім спакоі" [2, с. 354], "гаварыла спакойна, не мяняючы тону" [2, с. 353], "сцішаная, спакойная, як заўжды" [2, с. 387]. Акрамя таго, у адносінах да ўнучкі Усяслава Полацкага ў рамане часта выкарыстоўваюцца трапныя азначэнні "ўладная" і "гордая" ("уладная ігумення" [2, с. 392], "ёй … гордасці было не пазычаць" [2, с. 353]), што яскрава выяўляе валявы характар гэтай славутай асобы і акцэнтуе яе сацыяльны статус.

Так, яна клапацілася аб лёсе і славе Айчыны і добра разумела, што міжусобныя войны наносяць шкоду полацкай зямлі: "Што, апроч рэчак крыві людской, апроч пажараў і сытага крыку гругання над шляхамі, касцьмі засеянымі, прынеслі міжусобныя бойкі, князь-бацька?" [2, с. 36]. Ці іншае: "Докуль магло гэта прадаўжацца? Докуль будуць шукаць князі сілы і вольнасці? … Праз вайну згоды і шчасця не знойдзеш" [2, с. 54].

Разам з тым, Еўфрасіння не адмаўляла вядзенне абарончых войнаў: "Не, песні ў славу князя і дружыны ягонай складаліся не тады, калі яны багатую здабычу на шчытах прывозілі, а тады, калі яны зямлю сваю, волю яе баранілі, адстойвалі" [2, с. 356].

Міратворчая дзейнасць ігуменні згадваецца і ў "Аповесці жыцця і смерці святой і блажэннай і найпадобнейшай Еўфрасінні … ": "І не хацела яна бачыць, каб хто варагаваў: ні князь з князем, ні баярын з баярынам, ні з простых хто са сваім, але ўсіх жадала бачыць адзінадушнымі" [1, с. 53].

Варта ўзгадаць і іншыя яе гуманістычныя выказванні, якія не страцілі сваёй актуальнасці ў пачатку XXI стагоддзя: "Жывіце з мірам!" [2, с. 13]; "Хай слова божае навучыць … міралюбству і цярплівай любові да братоў сваіх!" [2, с. 54]; "Любі бліжняга свайго" [2, с. 353].

**Заключэнне.** На аснове фактаў, змешчаных у "Аповесці жыцця і смерці святой і блажэннай і найпадобнейшай Еўфрасінні … ", Т. Бондар быў створаны арыгінальны мастацкі вобраз першай усходнеславянскай святой, асветніцы-інтэлектуалкі, патрыёткі, гуманісткі, міратворцы і дыпламаткі.

Гераіня характарызуецца пры дапамозе такіх сродкаў, як апісанне знешняга выгляду, яе ўчынкі ў сюжэтным дзеяннні, перажыванні і інш.

Пісьменніцы ўдалося актуалізаваць ролю гістарычнай асобы, даць ацэнку яе культурна-асветніцкай і міратворчай дзейнасці, асэнсаваць яе значэнне ў нацыянальнай гісторыі, а таксама засяродзіць увагу на станаўленні гуманістычных і дэмакратычных традыцый у нашых продкаў. Думаецца, што асоба і дзейнасць гэтай эмансіпаванай жанчыны будзе і далей (у 2007 г. быў выдадзены наватарскі ў жанравым плане твор – раман-жыціе "Пакліканыя" В. Коўтун) прыцягваць увагу айчынных пісьменнікаў.

1. Аповесць жыцця і смерці святой і блажэннай і найпадобнейшай Еўфрасінні, ігуменні манастыра Святога Спаса і Найсвяцейшай Ягонай Маці, што ў горадзе Полацку. Багаславі, Ойча! // Кніга жыцій і хаджэнняў / уклад., прадм. і каментарыі А.А. Мельнікава. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1994. – С.42 – 57.
2. Бондар, Т.М. Спакуса: раман: для ст. шк. узросту / Т.М. Бондар. – Мінск: Юнацтва, 1989. – 398 с.

Репозиторий ВГУ